обучаемых, что предполагает применение их знаний и умений в новой учебной ситуации.

В дальнейшем количество обучающих экспериментов на филологическом факультете БГПУ будет заметно возрастать, так как, начиная с 2024–2025 учебного года, все студенты выпускного курса будут писать дипломные работы по методическим дисциплинам. В этой связи деятельность нашей лаборатории станет более востребованной. В тоже время мы предполагаем, что количество экспериментальных работ не снизит качество научно-методических разработок, а желающих принимать участие в деятельности студенческой научно-исследовательской лаборатории «Методическая наука в школе» станет еще больше. И, может быть, в перспективе у нас вырастут свои педагоги-новаторы, опытом которых мы будем гордиться!

**Список литературы**

1. Иванихин, В.В. Почему у Ильина читают все? / В.В. Иванихин. – М., 1990. – 160 с.

2. Лазовская, Д.О. Сочинение как способ развития словарного запаса учащихся / Д.О. Лазовская // Актуальные вопросы филологического образования в XXI веке: материалы Междунар. студ. науч.-практ. конф. в рамках Международного форума «Студенческая наука – инновационный потенциал будущего», Минск, 10 апреля 2024 / Белорус. гос. пед. ун-т им. Максима Танка; редкол.: Е.П. Жиганова, А.И. Жишкевич, Н.В. Заяц; отв. ред. А.И. Жишкевич. – Минск: БГПУ, 2024. – С. 206–208.

3. Психолого-педагогический словарь / сост. Рапацевич Е.С. – Минск: «Современное слово», 2006. – 928 с.

4. Савонь, А.С. Взаимосвязь восприятия и анализа в процессе изучения сказки А. де Сент-Экзюпери «Маленький принц» / А.С. Савонь // Актуальные вопросы филологического образования в XXI веке: материалы Междунар. студ. науч.-практ. конф. в рамках Международного форума «Студенческая наука – инновационный потенциал будущего», Минск, 10 апреля 2024 / Белорус. гос. пед. ун-т им. Максима Танка; редкол.: Е.П. Жиганова, А.И. Жишкевич, Н.В. Заяц; А.И. Жишкевич (отв. ред.). – Минск: БГПУ, 2024. – С. 211–213.

*Дата поступления в редакцию: 18.09.2024*

УДК 811.161.3'373.5

# ЭФЕКТЫЎНЫ ЎРОК БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ: ПАДЫХОДЫ І ПРАЕКТАВАННЕ

*Мартынкевіч Святлана Васільеўна*

***Анатацыя.*** *У артыкуле разглядаюцца асноўныя лінгваметадычныя падыходы і этапы праектавання ўрока беларускай мовы з пазіцыі кампетэнтнаснай асновы адукацыйнага працэсу. Прапанаваны варыянты пастаноўкі мэты і задач традыцыйных тыпаў урокаў, заснаваных на ўліку асаблівасцей псіхолага-педагагічных этапаў авалодання вучэбнымі дзеяннямі. Вызначаны патрабаванні да арганізацыі і распрацоўкі зместу ўрока, накіраванага на дасягненне прадметных, метапрадметных і асобасных адукацыйных вынікаў навучэнцаў, падаюцца парады да планавання дзейнасці настаўніка і вучняў на ўроку.*

***Ключавыя словы:*** *адукацыйны працэс, суб'ект-суб'ектная аснова, асобасныя адукацыйныя вынікі, урок беларускай мовы, мэта і задачы навучання, лінгваметадычныя падыходы.*

***Abstract.*** *The article examines the main stages of designing a Belarusian language lesson from the perspective of modern linguistic methodological approaches and the competence basis of the educational process. The variants of setting the goals and objectives of traditional lessons are proposed, based on taking into account the peculiarities of the psychological and pedagogical stages of mastering educational activities. The requirements for the organization and development of lesson content aimed at achieving subject, meta-subject and personal educational results of students are defined, and tips are given for planning the activities of teachers and students in the lesson.*

***Key words:*** *the educational process, the subject-subject basis, personal educational results, the lesson of the Belarusian language, the purpose and objectives of teaching, linguistic methodological approaches.*

На сучасным этапе развіцця адукацыі педагагічны работнік – настаўнік – мае вялікія магчымасці для таго, каб пазнаёміцца з разнастайнымі поглядамі сучасных вучоных на ўмовы арганізацыі адукацыйнага працэсу, асаблівасці вызначэння мэты і задач вучэбных заняткаў, этапы і крытэрыі ацэнкі іх эфектыўнасці, апрабаваць аўтарскія методыкі педагогаў-практыкаў, распрацаваць уласныя нетрадыцыйныя формы навучання. Аднак відавочна, што сярод шматлікіх інавацыйных форм навучання традыцыйны ўрок, заснаваны на ўліку асаблівасцей псіхолага-педагагічных этапаў авалодання вучэбнымі дзеяннямі, быў і застаецца адной з самых эфектыўных формаў сучаснай адукацыйнай практыкі. Падыходы і прынцыпы ўдасканалення адукацыйнага працэсу павінны быць арыентаваны на "формы і метады навучання навыкам XXI стагоддзя, развіццё гнасеалагічнага (інтэлектуальнага), інавацыйна-творчага, камунікатыў-

нага патэнцыялаў асобы" [7, с. 362]. Таму ў згаданым кантэксце менавіта ад умення настаўніка арганізаваць урок — вызначыць накіраванасць, логіку, структуру ўрока ў адпаведнасці з адукацыйнымі, развіццёвымі і выхаваўчымі мэтамі — будзе залежаць высокая пазнавальная актыўнасць вучняў і ўцэлым дасягненне імі асобасных адукацыйных вынікаў пры навучанні беларускай мове.

Сучасны ўрок беларускай мовы распрацоўваецца з улікам дыдактычных і метадычных патрабаванняў: вызначэння месца ўрока ў сістэме іншых урокаў, дакладнасці фармулёўкі мэты (трыадзінай у яе класічным варыянце) і задач урока — пазнавальных, камунікатыўных і лінгвакультуралагічных, адпаведнасці метадаў і прыёмаў, відаў заданняў вызначаным задачам, суадносін практычнай і тэарэтычнай частак урока. Арганічнае спалучэнне ўсіх элементаў павінна забяспечваць маўленчае асяроддзе, а метады выкладання новага матэрыялу, віды і спосабы замацавання уменняў вучняў, разастайныя формы кантролю паспрыяць выніковасці ўрока. Пры аптымальнай арганізацыі вучэбнага працэсу вынікам вучэбнай дзейнасці будзе трывалае і ўсвядомленае засваенне вучэбнага матэрыялу, як тэарэтычнага, так і практычнага. Гэта значыць, урок забяспечыць у вучняў належны ўзровень сфарміраваных моўных ведаў, на аснове якіх будзе адбывацца засваенне нормаў беларускай літаратурнай мовы, развіццё маўленчых і камунікатыўных уменняў — здольнасці аперыраваць моўнымі сродкамі ў працэсе маўлення, наладжваць камунікатыўны кантакт пры суразмоўніцтве. Дасягненню асобасных адукацыйных вынікаў паспрыяе і зместавае напаўненне ўрока — дыдактычны матэрыял, які забяспечвае метапрадметны складнік, выхаваўчы патэнцыял і інфармацыйнасць урока.

Разгледзім асаблівасці праектавання этапаў і распрацоўкі зместу традыцыйнага ўрока беларускай мовы ў кантэксце сучасных патрабаванняў да арганізацыі адукацыйнага працэсу.

Адукацыйны працэс ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі арганізуецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй, вучэбна-праграмнай дакументацыяй, адукацыйнымі праграмамі агульнай сярэдняй адукацыі. Адносна вучэбнага прадмета "Беларуская мова" неабходна ўлічваць, што ў сістэме навучання беларуская мова павінна стаць не толькі прадметам вывучэння, але і дзейсным сродкам фарміравання асобы, здольнай успрымаць на роднай мове прачытанае і пачутае, ствараць вусныя і пісьмовыя выказванні ў залежнасці ад мэты і задач камунікацыі. Таму вучэбны змест скіраваны перш за ўсё на фарміраванне функцыянальнай адукаванасці, сутнасць якой разумеецца "як інтэграваная здольнасць чалавека ажыццяўляць дзейнасць у грамадстве, вырашаць камунікатыўныя, пазнавальныя задачы, абапіраючыся на засвоены сацыяльны вопыт" [1, с. 42].

Кампетэнтнасны падыход, які прызнаны ключавым у адукацыі, вызначае агульныя прынцыпы адбору зместу навучання, арганізацыі і ацэнкі адукацыі, мэтай якой становіцца сукупнасць ключавых кампетэнцый вучня (А.Л. Андрэеў, А.А. Вярбіцкі, В.Л. Жук, Л.Ф. Іванова, В.В. Краеўскі, А.В. Хутарскі і інш.). Функцыі мовы ў грамадстве вызначаюць лінгваметадычныя асновы арганізацыі адукацыйнага працэсу, гэта значыць, канкрэтызуюць падыходы і прынцыпы навучання беларускай мове як сродку зносін, фарміравання грамадзянскасці, патрыятызму, маральнасці, засваенне духоўных каштоўнасцей праз выхаванне грамадзянскасці і патрыятызму, "павагі да сваёй Айчыны, народа, мовы, беларускай культуры, традыцый і звычаяў" [3] (малюнак 1).

Вучэбная праграма дакладна вызначае прадметныя, метапрадметныя і асобасныя адукацыйныя вынікі, якія карэлююць з мэтамі і задачамі навучання беларускай мове (малюнак 2).

Моўная кампетэнцыя складаецца з ведаў пра сістэму мовы на ўсіх яе ўзроўнях – фанетычным, лексічным граматычным, валодання правіламі функцыянавання моўных сродкаў у маўленні; нормамі




Малюнак 1. – Лінгваметадычная аснова працэсу навучання беларускай мове




Малюнак 2. – Адукацыйныя вынікі навучання вучэбнаму прадмету "Беларуская мова"

літаратурнай мовы. Маўленчая кампетэнцыя дазваляе перадаваць думкі сродкамі мовы ў вуснай і пісьмовай форме і карыстацца мовай у розных відах маўленчай дзейнасці. Камунікатыўная кампетэнцыя характарызуецца магчымасцю свабодна ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў у адпаведнасці з мэтамі і задачамі зносін, нормамі культуры маўлення, правіламі маўленчых зносін. Лінгвакультуралагічная кампетэнцыя прадвызначае усведамленне вучнямі мовы як феномена культуры, у якім знайшлі адбітак яе праяўленні, засваенне нацыянальна маркіраваных адзінак беларускай мовы, развіццё здольнасці адэкватна ўжываць іх у маўленні. Сацыякультурная кампетэнцыя – гэта засваенне сацыяльных нормаў маўленчых паводзін, культурных каштоўнасцей беларускага народа і агульначалавечых каштоўнасцей, ідэалаў, традыцый, звычаяў, фарміраванне здольнасці карыстацца культуразнаўчымі звесткамі ў працэсе маўленчых зносін, развіццё сродкамі мовы інтэлектуальнай, камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай культуры вучняў.

Метапрадметныя вынікі асваення зместу вучэбнага прадмета "Беларуская мова" вызначаны як гатоўнасць ажыццяўлць прыёмы разумовай дзейнасці: аналізаваць і сінтэзаваць, аперыраваць паняццямі, рабіць абагульненні, устанаўліваць аналогіі і прычынна-выніковыя сувязі, класіфікаваць, рабіць вывады і падагульненні. Разам з гэтым пісьменна і аргументавана выкладаць свае думкі ў вуснай і пісьмовай форме, адстойваць і абгрунтоўваць свой пункт гледжання. Навыкі ўсвядомленага чытання тэкстаў розных стыляў і жанраў дазваляюць выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі з вучэбна-пазнавальнымі мэтамі, працаваць з тэкставай і графічнай інфармацыяй, вылучаць галоўнае. Уменні рацыянальна і бяспечна выкарыстоўваць інфармацыйныя камунікацыйныя тэхналогіі пры рашэнні рознага роду задач, крытычна ацэньваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю, якая змяшчаецца ў розных крыніцах з'яўляюцца асобасна значмымі і запатрабаваныя ў розных сферах жыцця. Метапрадметныя ўменні і навыкі забяспечваюць здольнасць да вучэбна-даследчай і праектнай дзейнасці і гатоўнасць да самастойнай творчасці.

Асобасныя адукацыйныя вынікі – гэта сістэма каштоўнасных адносін да сябе і навакольнага свету: валоданне беларускай мовай як сродкам пазнання свету, далучэння да культуры як сістэмы каштоўнасцей і нормаў паводзін; валоданне пачуццём патрыятызму, гамадзянскасці; дэманстрацыя ўстойлівай цікавасці да самастойнай дзейнасці, самапазнання, самаразвіцця; здольнасць да супрацоўніцтва і камунікацыі ў розных сітуацыях і ўмовах маўленчых зносін. Такім чынам, адукацыйныя вынікі вызначаюць кірункі праектавання працэсу навучання беларускай мове.

Паняцце 'ўрок' вызначаецца двума паказчыкамі: першы – суб'ект-суб'ектная аснова арганізацыі дзейнасці вучняў і настаўніка, другі – структурная ар-

ганізацыя, гэта значыць, размяшчэнне ў пэўнай паслядоўнасці этапаў урока. Пабудова ўрока не можа зводзіцца да простага пераліку паслядоўных элементаў, а ўяўляе сабой упарадкаваную сістэму дзеянняў, актыўную працу настаўніка і вучняў.

*Тэма ўрока* — гэта фармулёўка вучэбнай праграмы, аб'ём моўнага і маўленчага матэрыялу. Тэмай урока можа быць вызначэнне відаў дзейнасці вучняў — кантрольная работа ці яе аналіз (работа над памылкамі).

Патрабаванні да *мэты ўрока* аб'ядноўваюць розныя погляды і адпаведна рэкамендацыі да яе фармулёўкі. У педагогіцы мэтамеркаванне — гэта працэс вызначэння мэты і задач, якія павінны адпавядаць запланаванаму выніку дзейнасці суб'ектаў адукацыйнага працэсу. Уменне ўстанавіць карэляцыю мэтаў настаўніка і вучняў з'яўляецца адным з галоўных крытэрыяў майстэрства педагога. Тыповымі памылкамі пры фармулёўцы мэты бываюць "завышэнне" вынікаў урока, падмена мэты вызначэннем сродкаў ці ўмоў правядзення ўрока, фармальны падыход да пастаноўкі мэты.

Асаблівай папулярнасцю сёння карыстаецца SMART-мэта, якая для сучасных настаўнікаў з'яўляецца прыцягальнай сваёй неардынарнасцю. "Канкрэтная мэта ўказвае, на што будуць накіраваны намаганні настаўніка і вучняў, што будзе правярацца ў ведах і ўменнях вучняў у ходзе ўрока і па яго заканчэнні; самі вучні павінны мець яе на зразумелай мове" [2, с. 35]. Варта браць пад увагу тое, што мова ўвогуле з'ява абстрактная, а канкрэтнае маўленне па-беларуску ў большасці выпадкаў незапатрабаванае вучнямі ў іх натуральным штодзённым суразмоўніцтве з сябрамі, бацькамі і інш. У сітуацыі субардынатыўнага білінгвізму ў вучняў даволі часта ўзнікае цяжкасць пры ўсведамленні асабістай патрэбы ў вывучэнні канкрэтнага матэрыялу па беларускай мове. Таму пры самастойнай фармулёўцы мэты ў вучня ўзнікае пэўная супярэчнасць: што буду ведаць, чаму навучуся і для чаго патрэбны дадзены матэрыял. Тым больш, сфармуляваць і запісаць самастойна мэту дзейнасці на ўроку ў большасці выпадкаў вучням складана. Таму матывацыя вучняў залежыць у пэўнай меры ад умення настаўніка зацікавіць, выклікаць жаданне вывучаць родную (нацыянальную) мову, стымуляваць працу вучняў праз стварэнне мікрамоўнага асяроддзя, у якім яны будуць адчуваць сябе псіхалагічна камфортна, не баючыся допусціць памылку. Выразы "мэта, на **мове** вучняў" ці "я даведаюся, **што такое** ..." (выдзелена аўтарам), якія часта ўключаюць настаўнікі ў план-канспект урока, парушаюць лагічнасць і культуру маўлення (лексічныя нормы — *мова вучняў* (???)), з'яўляюцца некарэктнымі ў дачыненні да моўных з'яў (*што такое?*), якія разглядаюцца на ўроку.

Выкарыстанне выразу "Мяркуецца (*предполагается* — рус.), што да канца ўрока вучні ..." арганічна стасуецца з такімі формамі навучання, як перакуленыя ўрокі, тэхналогія актыўнай ацэнкі вучэбнай дзейнасці, аднак пераважная большасць ўрокаў традыцыйнай будовы распрацоўваюцца адносна дыдактычнай мэты. Таму важным, на нашу думку, з'яўляецца перш за ўсё асэнсаванне настаўнікам асаблівасцей той формы навучання, распрацоўкай якой ён займаецца. Маючы на ўвазе традыцыйныя формы навучання (урок), тыпалогію ўрокаў паводле дыдактычнай мэты і традыцыйную тэхналогію распрацоўкі, пры фармулёўцы мэты ўрока варта арыентавацца на ўсведамленне канкрэтнасці вучэбных дзеянняў і матывацыю, якая складаецца з рэальных патрэбаў вучняў і стымулявання іх дзейнасці.

Традыцыйна мэта ўрока суадносіцца з тэмай і дыдактычным матэрыялам, які выкарыстоўвае настаўнік, уяўляе адзінства адукацыйнай, развіццёвай і выхаваўчай частак і заключаецца ў фарміраванні кампетэнцый. Кожная з заяўленых кампетэнцый вызначае кола задач навучання беларускай мове, якія з'яўляюцца канкрэтнымі крокамі у яе авалоданні.

Мэта навучання беларускай мове — сфарміраваць у вучняў сістэму ведаў пра мову і маўленне, навучыць карыстацца беларускай мовай ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці (чытанне, слуханне, гаварэнне, пісьмо); развіваць інтэлектуальную, камунікатыўную, духоўна-маральную, грамадзянскую культуру вучняў. Такім чынам, настаўнік пры вызначэнні мэты ўрока перш за ўсё арыентуецца на тое, каб вучні зразумелі і засвоілі моўную з'яву, авалодалі моўнай нормай, – гэта значыць, атрымалі пэўныя веды і навучыліся іх прымяняць. Таму пры пастаноўцы адукацыйнай мэты рэкамендуецца выкарыстоўваць дзеясловы, якія ўказваюць на дзеянне з пэўным прадметным адукацыйным вынікам: *даць паняцце, апісаць, разгледзець, растлумачыць сутнасць* і інш. Настаўнік з лёгкасцю можа знешне назіраць і дыягнаставаць, якія вынікі будуць мець вучні напрыканцы сумеснай (суб'ект — суб'ектнай) працы з педагогам: даць паняцце і апісаць моўную з'яву — вучні назавуць асноўныя рысы моўнай з'явы, разгледзець і растлумачыць сутнасць — вучні падбяруць моўныя прыклады (маўленчыя ілюстрацыі) і прывядуць іх у адпаведнасць з пунктамі правіла і інш. Развіццёвая мэта накіравана на фарміраванне агульнавучэбных і спецыяльных уменняў (метапрадметныя адукацыйныя вынікі) — удасканаленне мысленчых аперацый, развіццё эмацыйнай сферы, аналагічнага маўлення, камунікатыўнай культуры: вучыць *параўноўваць, выдзяляць галоўнае, класіфікаваць* і інш. Выхаваўчая частка накіраваная на фарміраванне ў вучняў пачуцця патрыятызму, грамадзянскасці, павагі да гістарычнага мінулага, стваральнай працы як галоўнай умовы развіцця беларускай дзяржавы, выхаванне культуры вучняў сродкамі мовы, якасцей, неабходных для сацыялізацыі вучняў.

Сістэма ўрокаў пастулова рэалізуе яе праз вырашэнне наступных задач:

1) моўнае і маўленчае развіццё вучняў на аснове засваення ведаў пра сістэму беларускай мовы на ўсіх яе ўзроўнях (фанетычным, лексічным, граматычным); валоданне нормамі беларускай літаратурнай мовы (арфаэпічнымі, акцэнталагічнымі, лексічнымі, фразеалагічнымі, словаўтваральнымі, марфалагічнымі, сінтаксічнымі, арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі), правіламі функцыянавання моўных сродкаў у

маўленні, развіццё ўменняў карыстацца мовай у розных відах маўленчай дзейнасці;

2) фарміраванне і развіццё камунікатыўных уменняў ствараць самастойныя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў маўлення ў вуснай і пісьмовай форме на прапанаваную і самастойна выбраную тэму на аснове авалодання маўленчай тэорыяй і культурай маўлення, спосабамі перадачы думкі ў вуснай і пісьмовай формах;

3) фарміраванне маўленчай культуры вучняў на аснове засваення мовы як формы выражэння нацыянальнай культуры, узаемасувязі мовы і гісторыі народа, нацыянальна-культурнай спецыфікі беларускай мовы; развіццё здольнасці карыстацца культуралагічнымі звесткамі для забеспячэння паўнавартаснай камунікацыі;

4) фарміраванне сродкамі беларускай мовы сістэмы агульначалавечых і нацыянальных ідэалаў, традыцый, звычаяў, каштоўнасцей беларускага народа, нормаў, якія рэгулююць паводзіны асобы ў грамадстве.

Важным на этапе праектавання ўрока з'яўляецца адбор дыдактычнага матэрыялу, пераважна тэкстаў. Важна тое, што на іх аснове вучням "... будзе прапанавана адпаведная спецыяльным чынам арганізаваная камунікатыўная дзейнасць – align разнабаковая, цікавая, матываваная, кантралюемая, асобасна значымая" [8, с. 182]. З улікам адзначанага, вызначым крытэрыі адбору тэкстаў для арганізацыі вучэбнай дзейнасці на ўроку:

1) інфармацыйная насычанасць, эстэтычная і выхаваўчая вартасць;

2) жанрава-стылявая і тыпалагічная разнастайнасць;

3) адаптацыя адносна ступені складанасці лексіка-граматычнай арганізацыі і ўзроставых асаблівасцей вучняў;

4) сітуацыйная аснова, якая стымулюе маўленчую дзейнасць у адпаведнасці са сферай зносін;

5) дэманстрацыя функцыянавання моўных адзінак у адпаведнасці з камунікатыўнымі якасцямі маўлення — дакладнасцю, дарэчнасцю, вобразнасцю, выразнасцю [4; 5].

Планаванне дзейнасці настаўніка і вучняў на кожным этапе ўрока суадносіцца з канкрэтнымі адукацыйнымі вынікамі пэўнага этапу. Разам з гэтым, на нашу думку, педагогу варта браць пад увагу наступныя парады:

1. Улічваць пры планаванні ўрока індывідуальныя асаблівасці вучняў і ўсяго класнага калектыву.

2. Аптымальна планаваць мэты і задачы ўрока:

— фармуляваць мэту ўрока комплексна (адукацыйная, развіццёвая, выхаваўчая);

— канкрэтызаваць зачады навучання адносна моўнай, маўленчай, камунікатыўнай, сацыякультурнай і лінгвакультуралагічнай кампетэнцый, улічваючы асаблівасці і ўзровень валодання вучняў беларускай мовай;

— прадумаць шляхі і спосабы рэалізацыі задач урока з дапамогай зместу, формаў, метадаў, сродкаў, умоў навучання і г.д.

3. Аптымальна забяспечваць змест урока. Улічваць патрабаванні праграмы, матэрыял вучэбнага дапаможніка, метадычных рэкамендацый:

— выдзеліць галоўнае, істотнае з пазіцыі пастаўленых вучэбна-выхаваўчых задач; выбраць найбольш рацыянальны варыянт логікі (індуктыўны ці дэдуктыўны) тлумачэння моўных з'яў (тэмы ўрока);

— дапоўніць змест вучэбнага дапаможніка, арыентуючыся на тэкставую тэматычную дамінанту новымі звесткамі (пазнавальнага, патрыятычнага, краязнаўчага, прафарыентацыйнага і інш. характару), прыкладамі, заданнямі, якія развіваюць навыкі вучэбнай работы, пазнавальныя інтарэсы і здольнасці вучняў на аснове дыферэнцыраванага і індывідуальнага падыходу.

4. Аптымальна выбраць тып і вызначыць структуру ўрока, прадумаць паслядоўнасць элементаў урока і размеркаваць час адносна напаўняльнасці этапаў урока

5. Выбіраць аптымальныя формы і метады навучання:

— прадумваць спалучэнне франтальнай, парнай, групавой, індывідуальнай формаў работы;

— улічваць пры выбары метадаў навучання перавагі кожнага з іх, арыентуючыся на пастаўленыя задачы, змест урока, індывідуальныя асаблівасці вучняў, узровень іх падрыхтаванасці.

6. Забяспечваць аптымальныя ўмовы для правядзення ўрока:

— вучэбна-матэрыяльныя (наяўнасць неабходнага для ўрока абсталявання);

— санітарна-гігіенічныя (паветраны і светлавы рэжым, размяшчэнне вучняў у класе, прафілактыка стамляемасці вучняў, правядзенне фізкультразмінкі і інш.);

— маральна-псіхалагічныя (педагагічны такт і аптымізм, адносіны з класам, псіхалагічны клімат у калектыве).

7. Выбраць аптымальны аб'ём і ацаніць складанасць дамашняга задання, дыферэнцыраваць яго з улікам рэальных вучэбных магчымасцей вучняў.

8. Прадумваць формы падвядзення вынікаў урока, фармулёўкі высноў.

9. Прадумваць навучальныя сітуацыі, якія стымулююць актыўную маўленча-камунікатыўную практыку;

10. Мэтэнакіравана праводзіць работу па папярэджанні моўных і маўленчых памылак у вучняў.

Такім чынам, сучасны ўрок беларускай мовы распрацоўваецца з улікам дыдактычных і метадычных патрабаванняў: вызначэння месца ўрока ў сістэме іншых урокаў, дакладнасці фармулёўкі мэты і задач урока, адпаведнасці метадаў і прыёмаў, відаў дзейнасці вызначаным задачам, суадносін практычнай і тэарэтычнай частак урока. Арганічнае спалучэнне ўсіх элементаў павінна забяспечыць маўленчае асяроддзе, а метады выкладання новага матэрыялу, віды і спосабы замацавання уменняў вучняў, формы кантролю паспрыяюць яго выніковасці. Пры аптымальнай арганізацыі вучэбнага працэсу вынікам вучэбнай

дзейнасці будзе трывалае і ўсвядомленае засваенне вучэбнага матэрыялу, гэта значыць, урок забяспечыць у вучняў належны ўзровень сфарміраваных моўных ведаў, на аснове якіх адбудзецца засваенне нормаў беларускай літаратурнай мовы, маўленчых і камунікатыўных уменняў – здольнасці аперыраваць моўнымі сродкамі ў працэсе маўлення і наладжваць камунікатыўны кантакт пры суразмоўніцтве. Менавіта такія адукацыйныя вынікі вызначаюць функцыянальнасць урока, яго адукацыйную вартасць.

**Спіс літаратуры**

1. Васюковіч, Л.С. Праца з тэкстам як аснова фаміравання функцыянальнай пісьменнасці вучняў : манаграфія / Л.С. Васюковіч. – Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава, 2024. – 177 с.

2. Запрудский, Н.И. Эффективный урок: проектирование, проведение и анализ : учебно-методическое пособие / Н.И. Запрудский. – 2-е изд. – Минск: Речь, 2024. – 264 с.

3. Концепция развития системы образования Республики Беларусь до 2030 года [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/images/2021/12/koncep-razv-sist-obrazov.pdf. – Дата доступу: 03.05.2024.

4. Мартынкевіч, С.В. Тэкставая дзейнасць вучняў у сістэме кампетэнтнаснага падыходу да навучання беларускай мове / С.В. Мартынкевіч // Вестник ВОИРО. – 2023. – №2(3). – С. 92–96.

5. Мартынкевіч, С.В. Сачыненне як творчая праца: ад тэорыі да практыкі / С.В. Мартынкевіч // Роднае слова. – 2023. – №8. – С. 57–60.

6. Махмутов, М.И. Современный урок: научное издание / М.И. Махмутов. – М.: Педагогическое общество России, 2005. – 286 с.

7. Теоретико-методологические основания дошкольного, общего среднего и специального образования в Республике Беларусь. В 2 ч. Ч. 1. / Н. П. Баранова [и др.]; под науч. ред. В.Ф. Русецкого. – Минск: Национальный институт образования, 2023. – 480 с.

8. Яленскі, М.Г. Лінгвадыдактычная парадыгма асобасна арыентаванага навучання мове ў сучаснай школе / М.Г. Яленскі. – Мінск: НІА, 2002. – 212 с.

*Дата поступления в редакцию: 30.05.2024*

УДК 373.2

# РАННЯЯ ПРОФОРИЕНТАЦИЯ ВОСПИТАННИКОВ В УСЛОВИЯХ УЧРЕЖДЕНИЯ ДОШКОЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ: ПРОБЛЕМЫ И ВОЗМОЖНОСТИ

*Остапюк Оксана Владимировна*

***Аннотация.*** *Дошкольный возраст наиболее благоприятен для педагогического воздействия. В статье рассматривается проблема ранней профессиональной ориентации детей дошкольного возраста как средства развития, личностного становления ребенка. Уделено внимание созданию условий для формирования трудовых умений и элементарных представлений о труде взрослых, воспитанию интереса к профессиям и результатам труда.*

***Ключевые слова:*** *дошкольное образование, первичные представления, профессиональная деятельность, готовность, дети дошкольного возраста, профессиональная ориентация, образовательный процесс, предметно-пространственная среда.*

***Abstract.*** *Preschool age is the most favorable for pedagogical influence. The article deals with the problem of early professional orientation of preschool children as a means of development, personal formation of a child. Attention is paid to creating conditions for the formation of labor skills and elementary ideas about adult labor, fostering interest in professions and labor results.*

***Key words:*** *preschool education, primary ideas, professional activity, readiness, preschool children, professional orientation, educational process, subject-spatial environment.*

Проблема формирования представлений о разных профессиях является актуальной, поскольку имеет социальную значимость для поступательного развития общества, его достижений в различных сферах деятельности. Результаты социологических исследований свидетельствуют о том, что значительная часть молодежи делает свой профессиональный выбор под влиянием родителей, сверстников, публичных личностей, отдают предпочтение престижным, популярным профессиям. Часто это обусловлено желанием быстрого получения высоких карьерных и финансовых результатов. Следует отметить, что среди молодежи утратили популярность рабочие профессии. Ориентируясь на получение профессионального образования как такового, без учета склонности к профессии, фактически ради диплома, молодые люди в дальнейшем испытывают неудовлетворенность собственным профессиональным выбором и, как следствие, теряют мотивацию к труду.

В настоящее время ранняя профориентация яв-